Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 294 (363)
НЯДЗЕЛЯ
22
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

Школы напярэдадні зімовых канікул

З 1-га студзеня, пасля поўгадовай пладатворнай вучобы, вучні школ пойдуць на зімовыя канікулы. Зараз ва ўсіх школах да канікул праводзяцца апошнія падрыхтаванні, падводзяцца вынікі соцыялістычнага спаборніцтва паміж школамі, класамі і асобнымі вучнямі.

Добрымі паказчыкамі ў вучобе сустракаюць другое поўгоддзе многія школы нашай області, асабліва такія, як 6-я сярэдняя яўрэйская школа г. Беластока, Гарадоцкая няпоўная сярэдняя беларуская школа, Заблудаўскага раёна, Ломжынская польская сярэдняя школа № 3 і рад іншых.

Галоўная ўвага настаўнікаў і вучняў накіравана зараз на паспяховае заканчэнне першага поўгоддзя, на ўзорнае выкананне вучэбных праграм. Трэба адзначыць, што вынікі першай чвэрці навучальнага года па многіх школах былі далёка нездавальняючыя. Так, сярэдняя паспяховасць па 15-й школе г. Беластока склала 61 процант, па 1-й польскай беластоцкай школе — 65 процантаў, 4-й польскай беластоцкай школе — 79 процантаў. Такім чынам, перад калектывамі педагогаў стаяла вялікая задача —узняць паспяховасць вучняў, палепшыць якасць урокаў, узмацніць выхаваўчую работу, разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва паміж калектывамі педагогаў, класамі і вучнямі. Над вырашэннем гэтай карэннай задачы педагогі многа папрацавалі. Многія настаўнікі паказалі сябе сапраўднымі майстрамі педагагічнага працэса, дасягнулі ўзорных вынікаў. Вось імёны гэтых настаўнікаў: Фешчанка, Храпунова, Якаўлева (15-я руская беластоцкая школа), Дамброўская, Камінскі (4-я сярэдняя польская школа г. Беластока), Н. Нізінская (1-я сярэдняя польская школа г. Беластока) і іншыя. Яны не толькі дабіліся выдатных паказчыкаў у паспяховасці вучняў, але і добра паставілі выхаваўчую работу.

Аднак у многіх школах ёсць істотныя недахопы. Так, у 15-й рускай школе г. Беластока ў 9-х і 10-х класах за першае поўгоддзе змяніліся 3 настаўнікі па рускай мове. І зараз гэтыя класы застаюцца без настаўніка. Гарадскі аддзел народнай асветы да гэтага адносіцца бясклопатна. Не зжыты яшчэ выпадкі парушэння працоўнай дысцыпліны настаўнікамі.

Нездавальняючым застаецца становішча з падручнікамі, асабліва па гісторыі, геаграфіі, на польскай мове. Слаба змагаюцца за якасць вучобы комсамольскія арганізацыі. Так, у 15-й рускай школе паспяховасць комсамольцаў складае 65 процантаў. Не знайшлі яшчэ свайго месца ў рабоце школы некаторыя комсоргі, якія за ўсё бяруцца і мала што даводзяць да канца. На гэтую справу гарадскі камітэт комсамола не звяртае дастатковай увагі. Чаго варты такі факт, калі ў першай польскай беластоцкай школе ў гэтым поўгоддзі змянілася 6 старшых піонерважатых. А добрая работа комсоргаў і піонерважатых мае для школы вялікае значэнне. Гэта бачна на прыкладзе 4-й польскай школы. Піонерская арганізацыя тут налічвае 70 чалавек. Піонеры з'яўляюцца перадавікамі вучобы, паказваюць узор адносін да заняткаў, да школьнай маёмасці і дысцыпліны. Гэтая школа гардзіцца такімі вучнямі-піонерамі, як Пажароўская (5-ы клас), Славікоўская М. (6-ы «Ц» клас), Яваровскі (6-ы «А» клас), Вілярская, Дардзінская (7-ы клас). Сёмы «А» клас гэтай школы трымае ў сябе пераходны чырвоны сцяг за добрую паспяховасць. Піонерская арганізацыя ў школе з'яўляецца вядучым атрадам вучняў.

Яшчэ ў многіх школах не зжыты выпадкі, калі вучні не з'яўляюцца на заняткі ў рэлігійныя святы. Настаўніцкі калектыў павінен узбройваць вучняў навуковым атэізмам і аб'ясняць ім шкоднасць усякіх рэлігійных забабонаў. Настаўніца Валавічаўскай школы, Сапоцкінскага раёна, тав. Стэфанская, даведаўшыся, што ў вёсцы пайшлі размовы аб нейкіх крывавых слупах на небе, з якімі жыхары звязвалі набліжэнне бядот, правяла ў школе гутарку аб формах і прычынах адлюстравання ў прасторы паўночнага ззяння. Вучні яе гутарку данеслі да сваіх бацькоў, і ўсялякія размовы аб «цудоўных» з'явах адпалі.

У гэтым поўгоддзі сярод настаўнікаў была шырока пастаўлена справа перадачы вопыту работы лепшых педагогаў праз адкрытыя ўрокі. У 1-й польскай школе горада Беластока праведзена 13 адкрытых урокаў, на якіх прысутнічалі настаўнікі чатырох школ. На адкрытым уроку у 4-м «Б» класе 15-й рускай школы па гісторыі народаў СССР прысутнічала 36 настаўнікаў горада Беластока.

Трэба ўказаць на значныя недахопы ў рабоце абласнога метадычнага кабінета: у ім адсутнічае пастаянны вопытны кіраўнік секцыі рускай мовы, няма неабходнай перыядычнай метадычнай літаратуры. Кабінет часамі не прыцягвае спецыялістаў педінстытута для аказання шляхам кансультацый неабходнай дапамогі настаўнікам рускай мовы.

Вялікая вытворчая актыўнасць настаўнікаў у гэтым поўгоддзі дапаўнялася і вялікай грамадскай работай на выбарчых участках. Настаўнікі школ з вялікім энтузіязмам працавалі агітатарамі, членамі выбарчых камісій. Настаўніцкі калектыў 17-й польскай беластоцкай школы цалкам удзельнічаў у выбарчай кампаніі. Усяго па Беластоку ў выбарчай кампаніі ўдзельнічала звыш 200 настаўнікаў. Многія з іх, як тт. Дублінская і Ціхаш (3-я школа), праявілі сябе добрымі агітатарамі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Настаўнікі прыкладваюць усе намаганні, каб дабіцца добрай пастаноўкі педагагічнага працэса, каб выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу комунізма, каб узорна арганізаваць і правесці канікулярны адпачынак вучняў і паспяхова завяршыць вучэбны год. Але ад гэтай справы не павінны стаяць у баку і органы народнай асветы. Неабходна прыняць меры для забеспячэння палівам школы на другое поўгоддзе. Патрэбна павярнуць тварам да патрэб школ і ўвагу гандлюючых арганізацый горада.

Першая палова навучальнага года заканчваецца. Вынікі работы вялікія, пладатворныя, аб іх скажуць настаўніцкія канферэнцыі. Зараз стаіць задача—паспяхова закончыць другую чвэрць і ўзорна арганізаваць канікулярны адпачынак вучняў.

Умовы соцыялістычнага спаборніцтва на лепшае правядзенне лесазагатовак 1940--1941 года леспрамгасамі, механізіраванымі лесапунктамі і трэстамі сістэмы Наркамлесу БССР

Падтрымліваючы ініцыятыву і пачын перадавікоў соцыялістычнага спаборніцтва брыгад лесарубаў 15-тысячнікаў тт. В. Гоціна, В. Міцкевіча, Зіновенка і іншых, разгарнуўшых усебеларускае спаборніцтва леспрамгасаў, механізіраваных лесапунктаў, брыгад лесарубаў, возчыкаў і вадзіцеляў машын, —Наркамлес БССР і рэспубліканскі камітэт профсаюза рабочых лесу і сплаву аб'яўляюць умовы спаборніцтва на лепшае правядзенне лесазагатовак і лесавывазкі 1940 — 1941 года.

Устанаўліваюцца наступныя паказчыкі:

ДЛЯ ЛЕСПРАМГАСАЎ, МЕХАНІЗІРАВАНЫХ ЛЕСАПУНКТАЎ І ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫХ ТРЭСТАЎ:

1. Датэрміновае выкананне квартальнага і гадавога плана лесазагатовак і вывазкі.

2. Перавыкананне плана прадукцыйнасці працы на загатоўцы і вывазцы лесу.

3. Поўны перавод пастаяннага кадра лесарубаў і возчыкаў і максімальны перавод сезонных рабочых на брыгадна-звеннявы метад работы і арганізацыя звенняў 15-тысячнікаў.

4. Поўнае асваенне і ўнядрэнне лучковых піл на лесазагатоўках.

5. Выкананне плана пагрузкі на чыгунцы і норм пагрузкі.

6. Поўнае выкананне правілаў тэхнікі безапаснасці.

7. Правільная арганізацыя тэхналагічнага працэса лесазагатовак. Добраякасная работа ў лесе: найбольшы выхад дзелавой драўніны і захоўванне норм ОСТ'а.

8. Уцягненне жанчын у звенні і брыгады на загатоўках і вывазцы лесу.

ДЛЯ ЛЕСПРАМГАСАЎ І МЕХАНІЗІРАВАНЫХ ЛЕСАПУНКТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ МЕХАНІЗІРАВАНЫ ТРАНСПАРТ:

а) датэрміновае выкананне праграмы механізіраванай вывазкі;

б) поўная ліквідацыя няпланавых прастояў;

в) выкананне плана пераабсталявання машын з вадкага на цвёрдае паліва;

г) поўная механізацыя пагрузачных работ;

д) арганізацыя падвозкі драўніны з прымяненнем навальшчыкаў і звальшчыкаў.

ДЛЯ ЗВЕННЯЎ ЛЕСАРУБАЎ:

1. Выкананне не менш 30 норм у месяц кожным лесарубам.

2. Рацыянальная распрацоўка драўніны, выкананне правілаў тэхнікі безапаснасці.

ДЛЯ БРЫГАД ВОЗЧЫКАЎ:

1. Выкананне не менш 30 норм кожным возчыкам па вывазцы і падвозцы лесу.

2. Добры догляд за канём, захоўванне ў належным парадку вупражу, копей, калёс і іншага інвентару брыгады.

ДЛЯ ВАДЗІЦЕЛЯЎ МАШЫН:

1. Выкананне не менш 30 норм вадзіцелем у месяц па вывазцы лесу.

2. Эканомія гаручага, змазачных матэрыялаў і захоўванне гумы.

3. Правільная эксплаатацыя машын і поўнае ўстараненне прастою па віне вадзіцеля.

ТЭРМІНЫ І ПАРАДАК ПРАВЕРКІ ВЫНІКАЎ СПАБОРНІЦТВА:

Для ацэнкі работы прадпрыемстваў, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтве, зацвердзіць журы ў саставе: наркома лясной прамысловасці БССР тав. Гайсіна (старшыня), старшыні Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў лесу і сплаву тав. Міхасенка, стаханаўца-лесаруба Асіпавіцкага леспрамгаса тав. Гоціна, стаханаўца брыгады возчыкаў Градзянскага механізіраванага лесапункта тав. Малішэўскага, кіраўніка трэста Мінлеспром тав. Гольдзіна і прадстаўнікоў рэдакцый газет «Звязда» і «Советская Белоруссия».

Вынікі спаборніцтва падагульняюцца штомесячна; за IV квартал 1940 года прысуджэнне прэмій праводзіцца не пазней 15 студзеня 1941 года па выніках выканання плана лесазагатовак і вывазкі 1940 года і не пазней 15 красавіка 1941 года па выніках выканання плана 1 квартала 1941 года.

ПРЫСУДЖЭННЕ ПЯРШЫНСТВА І ПРЭМІІ:

1. Журы пры выкананні вышэй указаных паказчыкаў **лепшаму леспрамгасу, механізіраванаму лесапункту** прысуджае **пераходны чырвоны сцяг Наркамлесу БССР і Беларускага рэспубліканскага камітэта профсаюза работнікаў лесу і сплаву і грашовую прэмію ў размеры 10 тысяч рублёў для прэміравання лепшых звенняў лесарубаў, возчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна-тэхнічных работнікаў.**

2. Леспрамгасу, механізіраванаму лесапункту, які заняў у спаборніцтве другое месца, — прысуджаецца **пераходны чырвоны сцяг Наркамлесу БССР і Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў лесу і сплаву і грашовая прэмія ў размеры 7.000 рублёў для прэміравання звенняў лесарубаў, возчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна-тэхнічных работнікаў.**

3. Леспрамгасу, механізіраванаму лесапункту, які заняў трэцяе месца, прысуджаецца **грашовая прэмія ў размеры 5.000 рублёў для прэміравання лепшых звенняў лесарубаў, возчыкаў, грузчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна-тэхнічных работнікаў.**

4. Лепшым брыгадам лесарубаў і возчыкаў, якія занялі першае месца ў спаборніцтве па выкананню плана, прысуджаецца **грашовая прэмія ў размеры 1.500 рублёў, а заняўшым другое месца — 1.000 рублёў.**

5. Лепшым вадзіцелям машын, якія занялі першае месца, прысуджаецца **грашовая прэмія ў 500 рублёў, а заняўшым другое месца — 300 рублёў.**

Наркамлес БССР і Беларускі рэспубліканскі камітэт профсаюза работнікаў лесу і сплаву заклікаюць усіх рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых лясной прамысловасці ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва, забяспечыць поўнае выкананне плана чацвертага квартала 1940 года, яшчэ шырэй разгарнуць стаханаўскі рух і сустрэць чацверты год трэцяй сталінскай пяцігодкі новымі вытворчымі перамогамі, вывесці лесазагатоўчую прамысловасць рэспублікі ў перадавыя рады.



Маладая ткачыха-стаханаўка 2-га тэкстыльнага камбіната Патоцкая Ф. І. — першая жанчына на камбінаце, перайшоўшая на абслугоўванне 2-х станкоў.

Фота А. Сапіра.

На шляху да рэнтабельнасці

Раскіданасць цэхаў Беластоцкага скурзавода № 2 патрабавала значна большай колькасці рабочых і абслугоўваючага персанала, чым гэта неабходна. На перавозку сыравіны з аднаго цэха ў другі штомесячна выдаткоўвалася звыш 9 тысяч рублёў.

На 1941 год становішча ў корані мяняецца. Прадугледжана канцэнтрацыя цэхаў у адным месцы. Цяпер на заводзе 180 рабочых. Пасля канцэнтрацыі частка рабочых будзе скарыстана на іншыя работы, дзякуючы чаму ўзрасце прадукцыйнасць працы. Так, напрыклад, чырвонадубны цэх, які выпускаў 235 тон вырабаў, будзе выпускаць 300 тон.

Завод налічвае зараз 11 чалавек кіруючага персанала. Пасля канцэнтрацыі патрэбуецца палова гэтай колькасці. Замест 32 вартаўнікоў, якія цяпер ёсць на заводзе, будуць толькі 8 — 10 чалавек.

Будучы год прынясе новыя поспехі калектыву скурзавода.

А. Аляксандраў.

—о—

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛАН

ГРОДНА. **(Па тэлефону).** Шырока разгортваючы соцыялістычныя метады працы, калектыў гродненскай абутковай фабрыкі індывідуальнага пашыву выканаў датэрмінова гадавую вытворчую праграму на 100,3 процанта. Выпушчана 34 тысячы пар абутку.

М. Сахрай.

Закрыўся IX з'езд КП(б) Латвіі

РЫГА, 20 снежня. (ТАСС). Учора IX з'езд КП(б) Латвіі тайным галасаваннем выбраў у члены Цэнтральнага Камітэта КП(б) Латвіі 35 чалавек: тт. Авотынь, Аўгусце, Ваверэ, Ванаг, Вараб'ёў, Гайліс, Густсон, Ф. Дэглаў, Дзеравянскі, Дамброўскі, Калнберзіньш, В. Лацыс, Лестэр, Ліберт, Лакціонаў, Нейланд, Новік, Нуржа, Озолінь, Паўлаў, Палдынь-Русіс, Пельшэ, Піесіс, Платэр, Плесмус, Пуго, Рапапорт, Салніс, Солднек, Спурэ, Сусайкоў, Фёдараў, Шаманін, Шыц, Яблонскі.

Кандыдатамі ў члены ЦК КП(б) Латвіі выбраны 11 чалавек: тт. Александровіч, Амерыкс, Архіпчыкаў, Вінгольд, А. Дэглаў, Кусін, Літвінаў, Міезіс, Папамароў, Смірноў, Фрыдман.

У рэвізійную камісію выбраны: тт. Бундуліс, Зандман, Мяснікоў, Сікстуле, Якаўлеў.

Пасля выбрання кіруючых органаў партыі Калнберзіньш аб'явіў IX з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Латвіі закрытым.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных даводзіць да ведама, што 1-ая сесія гарадскога Совета дэпутатаў працоўных адбудзецца 25 снежня 1940 года ў памяшканні гортэатра. Пачатак роўна ў 5 гадзін вечара.

Рэгістрацыя дэпутатаў будзе праводзіцца 25 снежня з 4 гадзін у гортэатры.

ГОРВЫКАНКОМ.

Па Совецкай краіне

20-ГОДДЗЕ ЛЕНІНСКАГА ДЭКРЭТА АБ КУРОРТАХ КРЫМА

21 снежня споўнілася 20 год з дня падпісання В. І. Леніным дэкрэта «Аб выкарыстанні Крыма для лячэння працоўных».

За гэтыя годы Крымператварыўся ва ўсесаюзную здраўніцу. Паўднёвае ўзбярэжжа здаўна было ўлюбёным месцам адпачынку. Але раней доступ сюды быў адкрыт толькі для цароў, памешчыкаў, духавенства і фабрыкантаў. З 1888 па 1912 год тут пабывала 360 тысяч чалавек. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя зрабіла народным здабыткам выдатныя здраўніцы. Толькі за апошнія два годы ў Крыму лячылася і адпачывала 540 тысяч працоўных і іх дзяцей. За 20 год на курортах і ў дамах адпачынку Крыма лячылася і адпачывала амаль 3,5 мільёнаў чалавек.

ПРЭМІРАВАННЕ ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР

Як вядома, Тэатр юнага гледача БССР быў удзельнікам усесаюзнага агляду дзіцячых тэатраў, які адбыўся ў Маскве.

Камітэт па справах мастацтваў пры СНК БССР за праробленую тэатрам вялікую работу ўзнагародзіў яго Пачотнай граматай. Група лепшых актораў прэміравана.



Сяляне пагранічных сёл аказваюць вялікую дапамогу пагранічнікам у барацьбе з нарушальнікамі граніцы.

На здымку: старшы лейтэнант М. Е. Варапнікаў (Н-скі пагранічны ўчастак) уручае вартаўніку сельсовета П. С. Арнауту прэмію за затрыманне нарушальніка граніцы. Фота В. Іванова. (Фота ТАСС).

«КЛІМАТ» ПАЛАЦА СОВЕТАЎ

Вялікі зал Палаца Советаў, як вядома, будзе змяшчаць 20 тысяч чалавек. Вышыня зала дасягне 100 метраў — гэта вышыня 25-павярховага небаскроба.

Звычайная вентыляцыя для такога гіганцкага будынка не падыходзіць. Вентылятар прапускае разам з вулічным паветрам жару і холад, вільгаць і пыл. У Палацы Советаў наведвальнікам трэба даць паветра, якое было-б такім чыстым, як паветра горных далін. Для будучага Палаца запраектавана «фабрыка клімату»

На вышыні 80 метраў ад зямлі ў сценах Палаца будуць змешчаны паветрапрыёмнікі. Па каналах паветра пранікне ў камеры кандыцыяніравання. У першым адсеку камеры паветры прыдзецца сутыкнуцца з металічнымі стружкамі, змазанымі маслам. Пыл асядзе на гэтых стружках.

У другім адсеку паветра будзе падаграваецца і прамывацца вадзяной заслонай. Далей паветра паступіць у сепаратар, дзе яно пакіне лішнюю вільгаць.

АНТАЛОГІЯ РУСКАЙ ПАЭЗІІ

Выдавецтва дзіцячай літаратуры ЦК ВЛКСМ прадпрыняла выпуск чатырохтомнай анталогіі рускай паэзіі XVIII — XIX стагоддзяў. Анталогія пазнаёміць маладых совецкіх чытачоў з гістарычным развіццём рускай паэзіі ў асобе яе лепшых прадстаўнікоў. Перад вершамі кожнага паэта друкуецца кароткі нарыс яго жыцця і літаратурнай дзейнасці. У заўвагах асвятляюцца гістарычныя здарэнні, аб якіх ідзе гутарка ў вершах, паясняюцца ўстарэўшыя словы або невядомыя чытачу імёны.

СКАРБ СТАРАЖЫТНЫХ МАНЕТ

МАГІЛЕЎ (БЕЛТА). Некалькі дзён таму назад у Магілеўскі гістарычны музей дастаўлен знойдзены калгаснікамі сельгасарцелі «Перамога», Шклоўскага раёна, вялікі скарб сярэбраных манет першай палавіны XVII стагоддзя. На большай частцы манет адчаканен партрэт польскага караля Сігізмунда III, астатнія—рыжскай чаканкі.

670 манет знаходзіліся ў гліняным кубку-капілцы арыгінальнай формы. Капілка мела толькі адну шчыліну для апускання манет. На паверхні кубка захаваліся сляды светлазялёнай паліроўкі.

АПОШНІ ТЫРАЖ У 1940 ГОДЗЕ

З Масквы ў Махач-Кала выехаў вагон Наркамфіна СССР з тыражным абсталяваннем. 23, 24 і 25 снежня ў Махач-Кала адбудзецца 4 тыраж выйгрышаў па пазыцы трэцяй пяцігодкі (выпуск другога года). Гэта — апошні тыраж 1940 года.

35 год з дня снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве

Генеральная рэпетыцыя Кастрычніцкай рэвалюцыі

Трыццаць пяць год назад загрымелі раскаты першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Значэнне гэтай рэвалюцыі велізарнае. В. І. Ленін пісаў, што «без «генеральнай рэпетыцыі» 1905 года перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі была-б немагчыма» (Ленін. Творы, том XXV, стар. 176).

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. была буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй, але яна рэзка адрознівалася ад усіх папярэдніх буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый на Захадзе тым, што падрыхтоўвалася і адбывалася ўжо ў эпоху загніваючага капіталізма—у эпоху імперыялізма. Рабочы клас у гэтай рэвалюцыі з'явіўся галоўнай рэвалюцыйнай сілай, **правадыром, кіраўніком** рэвалюцыі. Яго саюзнікам было сялянства. Буржуазія ў гэтай рэвалюцыі іграла ярка выражаную рэакцыйную, контррэвалюцыйную ролю, яна баялася рэвалюцыі, шукала згоды з царом супроць рэвалюцыі. Яна рыхтавалася раздзяліць уладу з царом, патрабуючы нявялікіх рэформ «для народа», каб «супакоіць народ» і расколоць рэвалюцыю.

Ленін лічыў, што **непасрэднай задачай** рэвалюцыі 1905 г. павінна быць звяржэнне царскага самадзяржаўя, увядзенне васьмігадзіннага рабочага дня, канфіскацыя ў карысць сялян памешчыцкай зямлі, **устанаўленне рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыята і сялянства.** Гэтая дыктатура павінна была замацаваць заваёвы рэвалюцыі, падавіць супраціўленне контррэвалюцыі, кіраваць барацьбой за пераастанне буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыялістычную.

Важнейшым сродкам звяржэння самадзяржаўя Ленін лічыў пабеданоснае ўзброенае паўстанне народа. Да гэтага падрыхтоўваў Ленін партыю і рабочы клас яшчэ задоўга да пачатку рэвалюцыі.

Эканамічны крызіс 1900—1903 гг., руска-японская вайна павялічылі бедствы мас і ўзмацнілі іх нянавісць да царызма.

Расстрэл безаброіных рабочых у Пецярбургу 9 (22) студзеня 1905 г. развязаў рэвалюцыю ў Расіі. Масы пачыналі разумець, што самадзяржаўе можа быць знішчана толькі сілай зброі. Большэвікі былі адзінай партыяй, якая прызнавала і высоўвала лозунг узброенага паўстання. Меншавікі вялі барацьбу супроць ўзброенага паўстання. На гэтай-жа пазіцыі сталі эсэры, анархісты і іншыя дробна-буржуазныя партыі і групы. Ленін і Сталін выкрывалі гэту здрадніцкую лінію меншавікоў. Хто не прызнае, што ўзброенае паўстанне ёсць майстэрства, указваў Ленін, хто не рыхтуецца да яго, таго трэба бязлітасна выкрываць як **праціўніка рэвалюцыі, здрадніка ці труса.**

Велізарнае значэнне ў падрыхтоўцы ўзброенага паўстання мелі рашэнні III з'езда партыі. З'езд указаў пралетарыяту шлях далейшай барацьбы супроць царызма, паставіў у парадак дня ўзброенае паўстанне і выпрацаваў тактыку партыі. Вызначаючы характар з'езда, Ленін указваў: «З'езд павінен быць (па ваеннаму) просты, (па ваеннаму) кароткі, (па ваеннаму) нямногалікі. Гэта—з'езд для арганізацыі вайны». (Ленінскі зборнік, т. V, стар. 153). З'езд намеціў рад рэвалюцыйных лозунгаў, якія павышалі рэвалюцыйную актыўнасць мас, арганізоўвалі іх для паўстання, падводзілі масы да паўстання.

Адным з такіх лозунгаў быў лозунг **масавых палітычных стачак**, якія з'яўляліся школай рэвалюцыі, магутным сродкам мабілізацыі і арганізацыі мас.

«Руская рэвалюцыя, — гаварыў Ленін,—з'яўляецца ў сусветнай гісторыі **першай**, але яна будзе, без сумнення, не апошняй,—вялікай рэвалюцыяй, у якой масавая палітычная стачка адыграла незвычайна вялікую ролю» (Ленін. Творы, том XIX, стар. 345). Агульная колькасць бастуючых рабочых за 10 год да рэвалюцыі была 430.000, а ў 1905 годзе—2.800.000 чалавек.

III з'езд партыі па прапанове Леніна высунуў новы тактычны сродак. З'езд заклікаў рабочых і сялян неадкладна ажыццяўляць **рэвалюцыйным шляхам**, не лічачыся з царскімі ўладамі і законамі, свае бліжэйшыя патрабаванні: 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыю памешчыцкай зямлі і інш. «На аснове гэтай тактыкі выраслі рэвалюцыйныя стачачныя камітэты у горадзе і рэвалюцыйныя сялянскія камітэты ў вёсцы, з якіх першыя развіліся потым у Советы рабочых дэпутатаў, а другія—у Советы сялянскіх дэпутатаў» (Гісторыя ВКП(б). Кароткі курс, стар. 68).

Найвялікшы поспех гэта новая тактыка непасрэднага рэвалюцыйнага дзеяння мела ў Закаўказзі. Кіруемы таварышам Сталіным Каўказскі саюзны камітэт РСДРП шляхам велізарнай друкаванай і вуснай прапаганды і агітацыі клікаў масы да **актыўных рэвалюцыйных** дзеянняў і арганізоўваў барацьбу мас. У Грузіі рэвалюцыйная барацьба мас адразу перарасла ва ўсенароднае ўзброенае паўстанне. **Ленін указваў, што на Каўказе «паўстанне падрыхтавана ўсяго лепш»**, што там «масавы характар пралетарскай барацьбы ўсяго мацней і ярчэй выражан» (Ленін. Творы, том IX, стар. 27).

Асаблівы вялікага ўздыму дасягнула рэвалюцыйная барацьба ў закаўказскай вёсцы. У радзе раёнаў Грузіі, у асаблівасці ў Гурыі, адбывалася бурнае ўзброенае паўстанне сялян. Сялянскія рэвалюцыйныя камітэты—органы ўзброенага паўстання рэвалюцыйнага сялянства—ажыццяўлялі захоп памешчыцкіх зямель, адмену ўсякіх падаткаў, байкот духавенства, урадавых устаноў.

III з'езд партыі ў прапанаванай Леніным рэзалюцыі «Па поваду падзей на Каўказе» асобна выдзеліў велізарную дзейнасць большэвіцкіх арганізацый Закаўказзя і заклікаў усю партыю аказваць ім усямерную падтрымку.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы і арганізацыі ўзброенага паўстання ў Расіі ігралі Советы, узнікшыя ў працэсе стачачнага руху.

Большэвікі разглядалі Советы як органы ўзброенага паўстання і пачатковыя органы **ўлады. 13 (даты даюцца па стараму стылю) кастрычніка** Совет рабочых дэпутатаў сфарміраваўся ў Пецярбургу; услед за Пецярбургам Советы рабочых дэпутатаў былі створаны ва ўсіх рабочых цэнтрах краіны. У Краснаярску, Іркуцку, Чыце былі створаны Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на чале якіх сталі большэвікі.

Советы дзейнічалі як **улада**. Іх уплыў быў велізарны. **Яны ажыццяўлялі захопніцкім шляхам** свабоду друку, устанаўлівалі васьмігадзінны рабочы дзень, арганізоўвалі ўзбраенне рабочых, стварылі баявыя дружыны для адпору «чорнай сотні», заклікалі насельніцтва не плаціць падаткаў царскаму ўраду і т. д.

Маркс і Энгельс не раз указвалі, што рэвалюцыя ёсць грамадзянская вайна, зыход якой рашаецца матэрыяльнай сілай зброі. У падрыхтоўцы паўстання Ленін, Сталін, большэвікі ўдзялялі велізарную ўвагу стварэнню ўзброеных сіл рэвалюцыі. Таварыш Сталін, выступаючы на мітынгу ў Тыфлісе ў дзень аб'яўлення царскага маніфеста 17 кастрычніка, у адказ на правакацыйныя крыкі меншавікоў: «Мы не хочам зброі»,—гаварыў:

«Якая рэвалюцыя можа перамагчы без **зброі** і хто той рэвалюцыянер, які гаворыць: далоў зброю? Прамоўца, які гэта гаворыць, напэўна талстовец, а не рэвалюцыянер, і хто-б ён ні быў, ён вораг рэвалюцыі, свабоды народа...»

«Што трэба,—пытаўся таварыш Сталін,—каб сапраўды перамагчы? Для гэтага патрэбны тры рэчы: першае, што нам трэба,—узбраенне, другое—узбраенне, трэцяе—яшчэ і яшчэ раз узбраенне» (Л. Берыя. «Да пытання аб гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі» стар. 57, выд. 1937 г.).

Партыя большэвікоў прымала ўсе меры да ўзбраення рабочых. Былі арганізаваны дастаўка і выраб зброі ў цэлым радзе пунктаў краіны. Па прапанове Леніна былі створаны баявыя рабочыя дружыны, якія складаліся з невялікіх атрадаў, мэта якіх заключалася ў тым, каб наносіць удары ворагу, арганізуючы партызанскую вайну, і кіраваць дзеяннямі мас. Ленін у цэлым радзе артыкулаў, пісем, дырэктыўных указанняў партыйным арганізацыям і іх органам—баявым камітэтам распрацаваў дэтальны план узбраення і дзеянняў баявых дружын.

Ленін і Сталін удзялялі вялікую ўвагу рабоце партыі ў войсках. Для рэвалюцыйнай работы ў царскай арміі і флоце ствараліся спецыяльныя ваенныя арганізацыі партыі. Іх задача заключалася ў тым, каб арганізаваць і ўзначаліць рэвалюцыйныя выступленні салдат і матросаў, якія шырока разгарнуліся за годы руска-японскай вайны, заваяваць перадавыя элементы войск на бок рэвалюцыі.

У канцы кастрычніка і пачатку лістапада 1905 года рэвалюцыя ўшчыльную падышла да ўзброенага паўстання. Краіна перажывала глыбокі рэвалюцыйны крызіс. Кастрычніцкая палітычная стачка ахапіла ўсю краіну і падняла да актыўнага палітычнага жыцця **ўвесь рабочы клас аж да самых адсталых слаёў.** У стачцы ўдзельнічала больш мільёна прамысловых рабочых.

Неабходнасць узброенага паўстання ў гэты момант диктавалася ўсёй унутранай і міжнароднай абстаноўкай.

Царскі ўрад, аб'явіўшы «маніфест 17 кастрычніка» і амністыю за палітычныя «злачынствы», прыкрываў мабілізацыю сіл рэакцыі. Ствараліся контррэвалюцыйныя арганізацыі накшталт «саюза рускага народа», арганізоўваліся сістэматычныя пагромы і збіванні дэманстрантаў. Было ўведзена асадное становішча на Каўказе, у Польшчы, у Фінляндыі і інш. Цар паспешна заключыў мір з Японіяй, каб развязаць сабе рукі для барацьбы з рэвалюцыяй.

На мабілізацыю сіл рэакцыі масы рабочых, салдат і сялян па закліку большэвікоў адказвалі ўзмацненнем баявой рэвалюцыйнай актыўнасці. Стачкі, дэманстрацыі, мітынгі, напады на жандараў і паліцыю, сутычкі з войскамі, ажыццяўленне **явачным парадкам рэвалюцыйных патрабаванняў—сталі паўсямеснай з'явай.** Рабочыя на заводах і фабрыках выраблялі зброю; расла баявая дружыны. Бурна развіваўся сялянскі рух па ўсёй краіне. **Нарастала рэвалюцыйнае** браджэнне ў войсках. Услед за паўстаннем салдат і матросаў у Кранштадце ў пачатку лістапада 1905 г. разгараецца паўстанне матросаў Чорнаморскага флота, кіруемае лейтэнантам Шмідтам; узнімаецца хваля салдацкіх бунтоў у Курску, Кіеве, Харкаве, Бабруйску, Ломжы, Мінску, у Сібіры, Закаўказзі.

У лістападзе Ленін звярнуўся ў Расію і прыняў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і арганізацыі паўстання. Праходзіўшая ў пачатку снежня 1905 г. канферэнцыя большэвікоў у Тамерфорсе, на якой упершыню сустрэліся Ленін і Сталін, прызнала ўзброенае паўстанне ўпаўне паспешным. Па парадзе Леніна, канферэнцыя спешна закончыла сваю работу і дэлегаты раз'ехаліся па месцах, каб прыняць удзел у паўстанні.

5 снежня Маскоўскі камітэт партыі прыняў рашэнне аб узброеным паўстанні ў Маскве.

Далей падзеі разгортваліся так:

6 снежня.—Маскоўскі Совет па прапанове большэвікоў аднагалосна рашыў пачаць усеагульную палітычную забастоўку з тым, каб перарасці яе ва ўзброенае паўстанне.

Совет прыняў адозву «Да ўсіх рабочых, салдат і грамадзян», у якой заклікаў да звяржэння самадзяржаўя шляхам узброенага паўстання.

7 снежня.—Пачалася ўсеагульная забастоўка ў Маскве і на чыгунках Маскоўскага вузла (акрамя Нікалаеўскай).

8—9 снежня.—У Маскве адбываюцца вулічныя мітынгі, сутычкі з паліцыяй і жандарамі. Народ будуе барыкады; войскі абстрэльваюць барыкады, грамяць вучылішча Фідлера, дзе заселі дружыннікі.

10—12 снежня.—Масква пакрылася сеткай барыкад: іх было пабудавана больш 100. **Жорсткія баракадныя баі адбываліся па ўсёй Маскве.** Паўстанне адбывалася ў радзе асобных раёнаў: у цэнтры, Краснай Прэсні, Міусах, Замаскварэччы, у раёне Казанскай чыгункі, у Сакольніках, у Рагожска-Сіманаўскім раёне.

15—17 снежня.—Ураду ўдалося падвезці ў Маскву войскі з Пецярбурга, Варшавы і іншых гарадоў. Больш усіх трымалася Красная Прэсня. Гераізм яе абаронцаў стаў вядомым усяму свету. Пасля некалькіх дзён артылерыйскага абстрэлу дружыннікі Прэсні спынілі барацьбу.

Маскоўскае паўстанне было падаўлена. Пачалася дзікая расправа з паўстаўшымі рабочымі.

Снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905 г., акрамя Масквы, ахапіла рад іншых гарадоў і прамысловых цэнтраў: Сормава, Растоў-на-Дану, Луганск, Горлаўку і Аляксандраўск у Данбасе, Матавіліху, Новарасійск, Севастопаль, Кранштат, Краснаярск і інш. Пажарам рэвалюцыі палымнела ўся Грузія, Фінляндыя, Прыбалтыйскі край. З бесчалавечнай жорсткасцю царызм падавіў усе гэтыя паўстанні.

Снежаньскае паўстанне было вышэйшым пунктам у развіцці першай рускай рэвалюцыі.

Меншавікі злараднічалі па поваду паражэння паўстання. Меншавік Плеханаў заявіў: «Не трэба было брацца за зброю».

Адказваючы на папрок Плеханава, Ленін пісаў: «Насупроць, трэба было больш рашуча, энергічна і наступальна брацца за зброю, трэба было раз'ясніць масам немагчымасць аднэй толькі мірнай стачкі і неабходнасць бясстрашнай і бязлітаснай узброенай барацьбы» (Ленін. Творы, том X, стар. 50).

Партыя большэвікоў кляйміла паводзіны меншавікоў, як здрадніцкія. Ленін і Сталін няўтомна раз'яснялі народу, што гэта паражэнне часовае, што трэба рыхтавацца да будучых рэвалюцыйных бітваў. Ленін і Сталін таксама дакладна і глыбока вывучалі ўрокі ўзброенага паўстання 1905 года, як Маркс і Энгельс вывучалі ўрокі Парыжскай Камуны 1871 года, таксама закончыўшайся паражэннем, але адыграўшай велізарную ролю ў класавай барацьбе міжнароднага пралетарыята.

Снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905 г. паказала, што перамога паўстання немагчыма без прапрацы, **сур'ёзнай падрыхтоўкі і ўзорнай арганізацыі.** Снежаньскае паўстанне загінула таму, што яно было слаба арганізавана. Так, у Маскве ў першыя-ж дні паўстання, яго штаб—Маскоўскі камітэт большэвікоў—быў арыштаваны, паўстанне пазбавілася кіруючага цэнтра і **распалася на рад асобных ачагоў.**

Адзін з асноўных урокаў снежаньскага паўстання Ленін бачыў у тым, што ўзброенае паўстанне, як майстэрства, патрабуе «адважнасмелае, бесчаваротна рашучае **наступленне».** «Абарона ёсць смерць усякага ўзброенага паўстання» (Энгельс).

Рабочыя, умацаваўшыся ў раёнах, змагаліся геройска. 13 дружыннікаў Казанскай чыгункі на працягу 4-х гадзін змагаліся супроць 400 салдат, узброеных гарматамі і кулямётамі. Дружыннікі Краснай Прэсні, Казанскага вузла праяўлялі цуды стойкасці, але наступлення, рашучага наступлення не было.

Адной з прычын падаўлення снежаньскага паўстання 1905 года была маласілкасць узброеных сіл рэвалюцыі. Не было энергічнай барацьбы за войска. У распараджэнні царызма ў Маскве было 15.000 салдат; з іх 2/3 былі з пункту гледжання царызма ненадзейныя. Рэвалюцыя мела ўсе шансы заваяваць іх, калі-б была арганізавана сапраўдная барацьба за войска, як гэта было напярэдадні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 года.

У 1905 годзе ў рэвалюцыйных рабочых яшчэ нехапала ўмення ўзяць у свае рукі кіраўніцтва рэвалюцыйна настроенымі салдатамі і матросамі, стаць на чале рэвалюцыйнай арміі і перайсці ў рашучае наступленне супроць царскага ўрада. Нямала шкоды прычынілі рабочаму класу меншавікі і эсэры, якія ўсяляк зрывалі ваенную работу большэвікоў.

У падаўленні рэвалюцыі 1905 г. дапамаглі царскаму ўраду і заходнееўрапейскія імперыялісты.

У рэвалюцыі 1905 года не было яшчэ трывалага саюза рабочых і сялян супроць царызма. Сяляне ўзнімаліся на барацьбу з памешчыкамі, але яны яшчэ не разумелі, што без звяржэння цара немагчыма звергнуць памешчыкаў. Сяляне дзейнічалі надта распылена, неарганізавана, недастаткова наступальна. Але рэвалюцыя паказала, што працоўнае сялянства з'яўляецца адзінай сур'ёзнай сілай, здольнай пайсці ў саюз з рабочым класам.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. мела велізарнае значэнне для перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 года. Народныя масы Расіі атрымалі першы вялікі ўрок рэвалюцыйнай грамадзянскай вайны. «Да ўзброенага паўстання ў снежні 1905 года народ у Расіі аказаўся няздольным на масавую ўзброеную барацьбу з эксплуататарамі. Пасля снежня гэта быў ужо не той народ. Ён перарадзіўся. Ён атрымаў баявое хрышчэнне. Ён загартаваўся ў паўстанні. Ён падрыхтаваў рады байцоў, якія перамаглі ў 1917 годзе...» (Ленін. Творы, том XXIII, стар. 451).

У агні рэвалюцыі 1905 года бліскуча вытрымала суровае выпрабаванне большэвіцкая стратэгія і тактыка. Глыбока вывучыўшы і максімальна выкарыстаўшы вопыт ўзброенага паўстання 1905 года, **партыя Леніна—Сталіна смела павяла ў кастрычніку 1917 года працоўных нашай краіны на штурм капіталізма і атрымала перамогу.**

Прафесар, брыгадны камісар І. ВОЛКАЎ.



Група рабочых і работніц Трохгорнай мануфактуры — удзельнікаў снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве. Справа налева: у першым радзе — С. Я. Зенкевіч, Г. А. Белоў, С. А. Косараў, Е. С. Салтыкова-Старасціна і А. С. Мажачкова; другі рад — А. В. Калпачова, В. П. Бахвалаў, Ф. А. Ламакіна і С. П. Сімонаў.

Фота П. Ігнаценка. Фота ТАСС.



На здымку: рэпрадукцыя з карціны «На барыкадах» — работы мастака І. Владзімірава. Фота ТАСС.

Тысячы новых актывістаў

(Гутарка з старшынёй Беластоцкага абкома саюза шарсцянікаў т. Прыцкерам).

Зараз, калі закончылася грандыёзная кампанія па выбарах дэпутатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, у якой удзельнічаў увесь народ заходніх абласцей Украіны і Беларусі, можна падвесці некаторыя вынікі масава-палітычнай работы.

Самае важнае заключаецца ў тым, што ў выбарчай кампаніі прымала ўдзел вялікая колькасць рабочых і служачых 26 тэкстыльных прадпрыемстваў Беластоцкай вобласці. Па самых скромных падліках, наш выбарчы актыў складаў 1.331 чалавек. Пераважная большасць таварышоў працавалі на выбарчых участках, у акруговых выбарчых камісіях. Яны праводзілі агітацыйную работу.

У пачатку выбарчай кампаніі на прадпрыемствах былі праведзены гутаркі з рабочымі аб міжнародным становішчы, Сталінскай Канстытуцыі, нацыянальнай палітыцы.

З вялікім уздымам прайшлі сходы па вылучэнню кандыдатаў. Большасць вылучаных кандыдатаў у дэпутаты на нашых прадпрыемствах — гэта лепшыя актывісты прафсаюзнай работы. Дэпутатам абласнога Совета выбран тав. Ленартоўскі—старшыня цэхавага камітэта ткацкага цэха плюшавай фабрыкі, тав. Жылюк — старшыня цэхавага камітэта камбіната № 1.

Вылучаныя дэпутатамі таварышы ў дні выбарчай кампаніі паказалі ўзоры высокай прадукцыйнасці працы. Тав. Плонскі, выбраны дэпутатам гарадскога Совета, у час выбарчай кампаніі пачаў працаваць на чатырох станках. У снежні ён даў каля 120 процантаў нормы. Выбраны дэпутатам ткач-стаханавец тав. Тыкоцкі з пачатку выбарчай кампаніі даваў не менш 118 процантаў нормы. Бліскуча працуюць цяпер выбраныя дэпутатамі тт. Стоцкая, Гелер, Фрэйзановіч і іншыя.

У час падрыхтоўкі да выбараў нашы маладыя фабзавкомы многаму навучыліся.

Зараз перад намі стаіць задача велізарнай палітычнай важнасці—у студзені пачынаецца кампанія справаздач і выбараў фабрычна-заводскіх, цэхавых камітэтаў і прафоргаў. З гэтай задачай прафсаюзныя арганізацыі тэкстыльнага Беластока павінны справіцца з чэсцю.

Даб'ёмся высокіх ураджаяў кок-сагыза

Што такое кок-сагыз? Гэта расліна, падобная на звычайны дмухавец. У сваіх кручкаватых карэньчыках ён мае каучук, неабходны для нашай прамысловасці. Кок-сагыз — новая культура. Год 9 таму назад яго знайшоў у гарах Цянь-Шаня камсамолец Буханевіч разам з калгаснікам Співачэнка. Вучоныя даследавалі гэту дзікую расліну і ўстанавілі, што гэта выключна каштоўная культура. Кок-сагыз мае многа высокаякаснага натуральнага каучуку.

Зараз для многіх калгасаў усходніх абласцей БССР кок-сагыз стаў звычайнай культурай як пшаніца і жыта. Так, напрыклад, калгас «13 кастрычніка», Рагачоўскага раёна, у мінулым годзе сеяў 10 гектараў кок-сагыза. Гэтыя 10 гектараў далі калгасу 100.000 рублёў даходу. У 1940 годзе плошча пад коксагызам у гэтым калгасе падвоілася. Калгаснікі атрымалі ўдвая больш даход—200 тысяч рублёў.

У нашай вобласці ў гэтым годзе ўпершыню вытвараны азімы пасеў кок-сагыза на плошчы 1,88 га ў калгасах Граеўскага і Сакалкаўскага раёнаў. Калгасы, якія сеюць кок-сагыз, павінны арганізаваць патрабны догляд за гэтай культурай: зімой трэба правесці снегазатрыманне, ранняй вясной да паяўлення ўсходаў трэба правесці ручное дробнае рыхленне міжрадзяў. Другое рыхленне праводзіцца на глыбіні 4—5 сантыметраў і наступныя рыхленнямі даводзіцца да 12—15 сантыметраў з максімальным набліжэннем да радка, але не закранаючы раслін. Плантацыя кок-сагыза павінна быць чыстай ад пустазелля і ўтрымлівацца ў рыхлым становішчы.

Адным з асноўных момантаў забеспячэння высокай якасці насення кок-сагыза з'яўляецца барацьба з некаўчуканосным дмухаўцом,—злосным шкоднікам кок-сагыза.

Стаханаўцы калгасаў павінны ўзяцца за вырашчванне каучуканосаў і дабіцца высокага ўраджаю.

Н. Курыльчык,
аграном абласнога зямельнага аддзела.

Па-большэвіцку перамагаць зімовыя цяжкасці

Зіма—суровы рэвізор чыгуначнага транспарта. Першы націск зімовай стыхіі з'явіўся сур'ёзнай праверкай боездольнасці, згуртаванасці і арганізаванасці калектываў станцый, паравозных дэпо, вагонных участкаў, дыстанцый пуці і сувязі.

У дні першых марозаў і снегападаў перадавыя чыгуначнікі, камандзіры і стаханаўцы Беластоцкай чыгункі практычна даказалі большэвіцкае ўменне перамагаць зімовыя цяжкасці. У час дзённага дзяжурства 18 снежня высокі клас работы паказала змена дзяжурнага на станцыі Беласток-Фабрычны тав. Антаневіча. Не гледзячы на выключна складаныя ўмовы, калектыў дабіўся выдатных вытворчых поспехаў.

План пагрузкі змена выканала на 180 процантаў, выгрузкі—на 109 процантаў. Усе поезды пры дзяжурстве тав. Антаневіча былі адпраўлены строга па графіку. Не гледзячы на тое, што дэпо выдала паравоз пад зборны поезд № 1112 з спазненнем на 40 мінут, поезд быў адпраўлен дакладна па наркомаўскаму графіку.

Што забяспечыла поспех змены тав. Антаневіча? Перш за ўсё тое, што калектыў змены змог проціпаставіць цяжкасцям зімы высокую арганізаванасць і большэвіцкую дзелавітасць.

Асабліва добра працавалі старшы стрэлачнік Ільіных, старшы агляднік вагонаў тав. Пятроў і саставіцель поездоў Якімаў.

У барацьбе за бесперабойную работу ў зімовых умовах добрых вынікаў дабіліся лепшыя машыністы дэпо Гродна. У ноч на 17 снежня машыніст-цяжкавагавік тав. Багатыроў добра правёў па ўчастку поўнаватавы поезд № 1177, перавыканаўшы норму тэхнічнай хуткасці на 8.3 кілометра. Паспяховы рэйс зрабіў машыніст пасажырскага паравоза тав. Кох. Пасажырскі поезд № 96 ён даставіў да станцыі дакладна па графіку, нагнаўшы ў шляху 10 мінут.

Узорна працуе сувязь на акалодку, дзе лінейным электрамеханікам тав. Хвальчук (ст. Лапы). Тут, не гледзячы на марозы, усе прылады дзейнічаюць бесперабойна. Па-большэвіцку перамагае зімовыя цяжкасці брыгада з 7 чалавек на станцыі Монькі (лінейны механік тав. Лешчынскі).

Калектыў Беластоцкай чыгункі датэрмінова закончыў выкананне гадавога плана пагрузкі. Чыгуначнікі абавязаліся да канца года звыш плана пагрузіць 40 тысяч вагонаў.

Аднак, побач з дадатнымі паказчыкамі ў рабоце ёсць і адмоўныя бакі. Ёсць нямала выпадкаў, калі паасобныя чыгуначнікі, у тым ліку і камандзіры, праявілі поўную безпапаможнасць ужо ў першыя марозы.

Так, напрыклад, у ноч на 18 снежня на Валкавыскай дыстанцыі сувязі (начальнік тав. Сабанцаў) у выніку нізкай якасці капітальнага і сярэдняга рамонту лініі сувязі і сігналізацыі ў радзе месц адбыліся абрывы правадоў. Адзін з рашаючых чыгуначных вузлоў Валкавыск быў зусім адрэзан ад штаба ўпраўлення дарогі на працягу 6 гадзін.

З-за дрэннай падрыхтоўкі да зімы і нясвоечасовага ацяплення дэпо ў Беластоку 13 снежня быў замарожан інжэктар і абедзве вадапрыёмныя трубы ў паравозе, які стаяў на прамыўцы.

Народны камісар шляхоў зносін Лазар Майсеевіч Кагановіч патрабуе, каб у любы час, у любое надвор'е поезды рухаліся аднолькава чотка. Прамы абавязак усіх чыгуначнікаў і камандзіраў Беластоцкай чыгункі—з чэсцю выканаць гэта патрабаванне наркома і забяспечыць бесперабойны рух поездоў у зімовы час.

А. Кандрацьеў.

ХУТЧЭЙ ЗАКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА БЕЛАСТОЦКАЙ МТМ

Беластоцкая машынна-трактарная станцыя, якая па рашэнню ўрада будуецца ў Дайлідах, мае выключнае значэнне ва ўмовах нашай вобласці. Зараз МТС рыхтуюць свой парк да вясенніх палявых работ. Многа трактараў трэба рамантаваць. Большасць МТС павінна забяспечыць рамонтам трактараў Беластоцкая МТМ.

Трэба сказаць, што самой майстэрні як такой няма яшчэ. Яна павінна была быць пабудавана ў кастрычніку, а на сённяшні дзень выведзены толькі сцены. У механічным цэху і кацельні накрыт дах, наслана столь. Устаноўлены станкі—шліфавальны, два такарных, свідравальны, абдзірачны, расточны для расточкі цыліндраў і выпрабавальны—для выпрабавання адрамантаванага матора. Але ў кацельнай не змуроваи фундамент для рухавіка, для прывядзення ў рух шліфавальнага станка няма тысячы метраў тоўстага меднага провада. Каб пусціць гэтыя цэхі, трэба толькі ўставіць вокны і дзверы і ацяпліць столь. З-за гэтага нельга зараз праводзіць усе ўнутраныя работы.

Вялікіх работ патрабуе дабудова другога — велізарнага разборачнага цэха. Тут не кончаны цагельныя работы па кладцы ўнутрыапорных стоек, няма даха, бо не пастаўлены яшчэ фермы пад дах.

А тым часам МТМ атрымала ўжо 28 трактарных матораў для рамонту. Іх прыходзіцца пакуль рамантаваць у старой механічнай майстэрні, што знаходзіцца ў Беластоку (Фабрычная, 19), якая зусім не прыстасавана і не абсталявана для гэтай работы. Пакуль майстэрня адрамантавала і сабрала каля шасці матораў, але іх нельга лічыць гатовымі, бо недзе выпрабаваць. Каленчатыя-ж валы МТМ возіць абточваць ажно ў Слуцк. А свой новы першакласны шліфавальны станок, на якім за дзень можна абточваць 10—12 валаў, нельга пусціць у ход.

Умовы ў самой майстэрні, дзе зараз рамантуюць маторы, немагчымыя. Па-першае, выключная цеснага. Калі адначасова разбіраць тры маторы, рабочыя перашкаджаюць адзін другому, работа не спорыцца. У памяшканні майстэрні холадна, і тут нельга рабіць заліўку падшыпнікаў, бо гэта работа не церпіць вагання тэмпературы.

Нехапае ў МТМ і кваліфікаваных кадраў: такароў, мантажнікаў, няма каваля. Тэхнічны кіраўнік майстэрні тав. Ладзік павінен і ў старой майстэрні сачыць за работай і ў новай рабіць мантажныя работы па ўстаноўцы станкоў.

Адпалі-б усе гэтыя перашкоды, калі-б майстэрня перайшла ў новае памяшканне. Чаму-ж так зацягнулася будаўніцтва? Чаму такая дробная работа, як устаноўка вокан, тармозіць вялікую справу?

МТМ не адпусцілі належных фондаў на будаўніцтва, якое ацэньваецца ў 300 тысяч рублёў. Дырэктар майстэрні тав. Фішкін стаў знаходзіць выхад у «самазагатоўках» будаўнічых матэрыялаў. Адсюль былі пераплаты супроць устаноўленых дзяржаўных цэн. Тут патрэбен быў больш энергічны націск тав. Фішкіна на арганізацыі, якія павінны былі забяспечыць будаўніцтва.

Але была другая прычына, якая зрывала работу. МТМ яшчэ ў пачатку жніўня заключыла дагавор на будаўніцтва з будаўнічым трэстам. Трэст абавязаўся закончыць будаўніцтва да 20 кастрычніка г. г., але вось прайшло ўжо 20 снежня, а майстэрня стаіць яшчэ напалову без даха. Чарапіца для пакрыцця ёсць. І лес для ферм быў загатоўлен—сухія яловыя брусы. А цяпер, калі з усіх бакоў націснулі на будаўнікоў, яны знайшлі, што яловыя брусы непрыгодны — чарцёж указвае першасортную сасну. Брусы гэтыя ляжаць даўно, і паўстае пытанне: дзе-ж былі вочы будаўніка, гэта значыць будтрэста, які своечасова не патрабаваў ці не дапамог замяніць асартымент лесу?

Падобная-ж з'ява з цэглай. Майстэрня спачатку прывозіла то пабітую цэглу з старых будынкаў, то невялікімі порцыямі з заводаў. Ці мог будтрэст дапамагчы тут, улічваючы асаблівую важнасць будаўніцтва? Мог! З некаторых будоўляў можна было нераключыць па невялікай колькасці для МТМ, каб закончыць у тэрмін усю цагельную кладку, выканаць у тэрмін свой дагавор. Нарэшце-ж, у апошні час для МТМ на станцыі Монькі ляжыць 70 тысяч штук цэглы, чыгунка дала вагоны, а будтрэст цэглу не забірае.

Ды многа мог-бы дапамагчы будтрэст. Але Беластоцкі будтрэст такі падрадчык, які глядзіць, каб заказчык наклаў яму цэлыя горы гатовых фандыраваных матэрыялаў, а ён будзе будаваць па меры сіл сваіх. Калі-ж абком партыі патрабаваў ад дырэктара будтрэста Левіна сур'ёзных адносін да будаўніцтва МТМ, Левін паабяцаў, што будаўніцтва будзе скончана максімум да 25 кастрычніка, а да 7 лістапада майстэрня будзе працаваць. Але гэта было вочкаўціпрацельствам.

Трэба сказаць і яшчэ аб адным сур'ёзным баку справы, што перашкаджае рабоце МТМ. Спрачаюцца між сабой дырэктар Фішкін і памочнік па палітчасці Панюхін. Памочнік гэты лічыцца толькі па штату, а на справе ён толькі і робіць, што настройвае людзей супроць Фішкіна. А вось сапраўднага партыйна - палітычнага кіраўніцтва калектывам, згуртавання рабочых майстэрні вакол выканання вялікіх задач—гэтага Панюхін не забяспечвае.

Зараз на будаўніцтве наметціўся пералом. Абком партыі ўзяў усю справу пад свой кантроль. Мабілізавана з калгасаў каля 40 цесляроў, якія здолеюць кончыць свае работы ў некалькі дзён: да новага года майстэрня разлічвае перабрацца ў новае памяшканне, дзе будуць умовы для выканання свайго вялікага задання. План рамонту трактараў будзе выканан у тэрмін, калі зараз будаўнікі па-большэвіцку возьмуцца за справу, калі сама дырэкцыя МТМ не будзе дапускаць промахаў, калі рабочыя будуць забяспечаны неабходнымі ўмовамі жылля і работы.

І. Клінаў.



Чытка газет у час абедзенага перапынку на абутковай фабрыцы № 2 у гор. Беластоку. Чытае начальнік планавага аддзела С. А. Іваноў.
Фота А. Сапіра.

ПАСПЯХОВА ПРАВЕСЦІ АГЛЯД ДРАМГУРТКОЎ

15 снежня 1940 года ва ўсіх рэспубліках і абласцях Савецкага Саюза пачаўся ўсесаюзны агляд драмгурткоў, які праводзіцца ЦК ВЛКСМ, Народным Камісарыятам асветы РСФСР, Усерасійскім тэатральным таварыствам. Мэтай праваадзімага мерапрыемства з'яўляецца развіццё і павышэнне ідэйна-палітычнага і мастацкага ўзроўню тэатральнай самадзейнасці, паляпшэнне палітычнага, культурнага і мастацкага выхавання і арганізацыі сістэматычнай вучэбнай работы сярод удзельнікаў самадзейных тэатральных калектываў, уздым іх творчага ўзроўню ў барацьбе за мастацтва сацыялістычнага рэалізма.

Агляд ставіць сваёй задачай — папаўненне рэпертуара тэатральных калектываў лепшымі п'есамі савецкіх драматургаў і класікаў, шырокае прыцягненне майстраў тэатра для творчай дапамогі тэатральнай самадзейнасці, паляпшэнне ўмоў работы калектываў: прадастаўленне памяшканняў для заняткаў і спектакляў, забеспячэнне неабходным інвентаром, падручнікамі і інш.

Усе гэтыя задачы маюць адну мэту: уцягнуць у самадзейнасць шырокія масы насельніцтва і падняць значэнне тэатральнай самадзейнасці ў справе комуністычнага выхавання працоўных.

Перад беластоцкім Домам народнай творчасці стаяла вельмі важнае пытанне забеспячэння гурткоў неабходным высока-ідэйным мастацкім рэпертуарам і, галоўнае—перакласці п'есы на польскую і яўрэйскую мовы. Зараз усе гурткі маюць у сябе п'есы на роднай мове. Істотным недахопам самадзейных драмгурткоў у нашай вобласці з'яўляецца адсутнасць рэпертуара на беларускай мове.

Дому народнай творчасці не ўдалося к гэтаму агляду прыцягнуць работнікаў прафесіянальных тэатраў.

У нас ёсць выдатныя ўмовы для правядзення гэтых мерапрыемстваў. Польскі тэатр абавязан заняцца кіраўніцтвам гурткоў мастацкай самадзейнасці на польскай мове. Гэта-ж адносіцца і да яўрэйскага драматычнага тэатра.

Па гораду Беластоку ў агляд уключыліся 22 драматычных калектывы. Раёны маюць 26 гурткоў, уключаных у агляд. Гэтыя 48 гурткоў ахопліваюць звыш 500 чалавек удзельнікаў. Дом народнай творчасці праводзіў нарады з кіраўнікамі гурткоў, з палітасветінспектарамі абласці па пытанню правядзення агляду. Але гэтага мала. Абласная камісія па правядзенню агляду, куды ўваходзяць прадстаўнікі абкома і гаркома партыі і комсамола, работнікаў мастацтва, прафарганізацый і т. д., павінна ўзначаліць жывое кіраўніцтва раённымі камісіямі, якія абавязаны правесці ў жыццё задачы, пастаўленыя перад імі.

Агляд пачынаецца з 22 снежня. Гурткі маюць абшырны рэпертуар: «Васа Жэлезнова» М. Горкага (у пастаноўцы драмгуртка пры шклозаводзе), «Воблік дня» — В. Васілеўскай (на 3-ім тэкстыльным камбінаце), «Платон Крэчэт» — А. Карнейчука (на 18-й тэкстыльнай фабрыцы), «Пагранічнікі» — Біль-Белацэркоўскага (на 1-ым тэкстыльным камбінаце), «Зямка Капач» — Даніэля і інш. Агульнагарадскі гродненскі драмкалектыў рыхтуе «Без віны вінаватыя» — А. Астроўскага.

Акрамя названага рэпертуара сучасных драматургаў і класікаў, самадзейныя калектывы маюць аднаактныя п'есы: «У лесе» — Малчанава, «Дырэктар» — Гершэнзона, «На паўстанку» — Ульянінскага. Гродненскі гурток велазавода прадставіць на аглядзе «Чужое дзіця»—Шкваркіна. У Снядаве будзе пастаўлена «Карчма на румынскай граніцы» — Шатровых.

У сувязі з рашэннем X пленума ВЦСПС аб пераходзе самадзейнасці на грамадскія рэльсы, 90 процантаў кіраўнікоў гэтых гурткоў працуюць без аплаты іх работы. Гэта ўмова тым больш усугубляе неабходнасць узмацнення кіраўніцтва іх работай.

Агляд у нашай вобласці пачынаецца пазней таму, што ўсе калектывы прымалі актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў у мясцовыя органы савецкай улады. Агляд будзе праходзіць да канца студзеня месяца 1941 года. Застаўшыйся час неабходна скарыстаць найбольш плодатворна, каб гурткі атрымалі максімум дапамогі з боку партыйных, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый, а таксама дапамогу з боку работнікаў мастацтваў, артыстаў, рэжысёраў. Толькі непасрэдная дапамога названых арганізацый забяспечыць паспяховае правядзенне агляду тэатральнай самадзейнасці Беластоцкай вобласці.

А. Пакроўскі.

Падсобная гаспадарка 9-га камбіната

Дырэкцыя, партыйная і профсаюзная арганізацыі 9-га тэкстыльнага камбіната (Міхалова) многа ўвагі ўдзяляюць сваёй падсобнай гаспадарцы (загадчык гаспадаркі ткач тав. Абрамінкі). Гаспадарка мае 12 кароў, 23 свінні, 25 авечак.

У дастатковай колькасці было засеяна гародніных культур: выкапана 67 тон бульбы, знята 12 тон капусты, 12 тон проса, 1,4 тоны грэчкі. Дзіцячы сад камбіната і фабрычны ларок забяспечаны поўнасцю мясам, гароднінай і бульбай.

У 1941 годзе значна пашырыцца плошча насеваў. Яшчэ ўвосень паднята 36 гектараў зябліва пад яравыя культуры, асвоена 3 гектары цаліны. Свайго гною нехапае, таму яго загатаўляюць у горадзе. Закуплена 25 тон мінеральных угнаенняў.

Для развядзення расады прадугледжваецца закладка 20 парніковых рам.

Гаспадарка павінна задаволіць патрэбы рабочых камбіната гароднінай на працягу круглага года.

Ю. Готліб.

Забыты дагавор

Перад пачаткам веснавой сяўбы калгаснікі і аднаасобнікі Гродненскага раёна выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва сваіх суседзяў з Скідзельскага раёна на лепшае заканчэнне сельскагаспадарчага года. Выклік гродненцаў горача сустрэлі працоўныя Скідзельскага раёна. З абодвух бакоў былі ўзяты канкрэтныя абавязацельствы.

Калі закончылася веснавая сяўба, у райкомы партыі сталі прыходзіць прадстаўнікі з калгасаў і вёсак з просьбай арганізаваць праверку выканання ўзятых абавязацельстваў. Але ў райкомах чамусьці да гэтай справы адносіліся няўважліва.

Пасля заканчэння ўборкі сакратар Гродненскага райкома партыі тав. Кульбацкі ўспомніў аб дагаворы і рашыў паслаць у Скідзэль прадстаўнікоў для праверкі дагавора. Пачалі падбіраць людзей для пасылкі, а потым хутка аб гэтым усе забылі. Не падумалі аб праверцы і скідзельскія раённыя арганізацыі.

Сельскагаспадарчы год заканчваецца. У Гродне парапейшаму забываюць аб праверцы дагавора. У Скідзелі прытрымліваюцца другой думкі. Сакратар райкома партыі тав. Капашонак заяўляе: «Яны нас выклікалі. няхай першымі і прыязджаюць правяраць».

В. Г.

„Нараджэнне хрыстова“ і зімовыя „святкі“

На рубяжы новага года веруючыя хрысціяне спраўляюць так званае «нараджэнне хрыстова». Што-ж прадстаўляе сабой гэта рэлігійнае свята, як яно зарадзілася і якая сапраўдная яго сутнасць?

Навука ўжо даўно ўстанавіла, што Хрыстос—асоба выдуманая, міфічная. У сапраўднасці ён ніколі не існаваў і, значыць, не мог і нарадзіцца.

Ні адзін з помнікаў эпохі, да якой царкоўнікі адносяць нараджэнне і жыццё Ісуса Хрыста, не ўпамінае аб ім ні словам. Рымскія, грэчаскія, яўрэйскія пісьменнікі і гісторыкі таго перыяда пільна, парой з дэтальнымі падрабязнасцямі, апісваюць сучасныя ім падзеі, пералічваюць усіх хоць некалькі значных людзей, жыўшых у іх годы. Ці можна дапусціць, каб яны нічога не сказалі аб столькі знамянітым, судзячы па евангелю, прароку, як Хрыстос, калі-б ён сапраўды існаваў, і аб такіх дзівосных цудах, як тыя, якія ён, згодна рэлігійных сказанняў, рабіў? Вядома, дапусціць гэтага нельга. Аб Хрысце маўчаць такія пісьменнікі I—II вякоў нашай эры, як Іосіф Флавій, Філон Александрыйскі, Юст з Тыверыяды, Плутарх, Тацыт, Светоній і іншыя. Хрыста не існавала, і таму, натуральна, не маглі нічога аб ім сказаць.

Адсутнасць гістарычных сведчанняў аб існаванні Хрыста так абескуражыла папоў, што яны рашыліся на яўны падлог. У творах некаторых гісторыкаў, напрыклад, Тацыта былі зроблены позніх ўстаўкі, у якіх упаміналася аб існаванні Хрыста. Але навуцы не цяжка было выкрыць гэта папоўскае машэнніцтва і паказаць, што яно з'яўляецца лішчым падцвярджэннем хлуслівасці царкоўных сказанняў аб Хрысце.

Адзінымі старажытнымі кнігамі, якія гавораць аб Хрысце, з'яўляюцца евангеллі. Але, па-першае, яны напісаны значна пазней таго часу, да якога царква прыўрочвае нараджэнне Хрыста; па-другое, яны поўны такіх супярэчнасцей і неасведамленняў, так безнадзейна заблытаны, што навука даўно ўжо адмовілася ад карыстання імі, як гістарычнымі дакументамі. Евангеллі прадстаўляюць сабой ні што іншае, як зборы ўсемагчымых легенд, казак, якія распаўсюджваліся прапаведнікамі хрысціянства ў народзе. Напісаны яны рознымі людзьмі, у розны час і на розны лад. Сама хрысціянская царква для таго, каб пазбегнуць недавер'я да царкоўнага вучэння нават з боку фанатычна веруючых, вымушана была ў канцы канцоў з многіх дзесяткаў хадзіўшых па руках і супярэчлівых адзін другому евангелляў адабраць чатыры і аб'явіць іх «боганатхнёнымі». Але і гэта не дапамагло. Яўныя супярэчнасці асталіся, а падчышчаць абнародаваныя тэксты стала ўжо няручна.

Сама легенда аб Хрысце, аб яго нараджэнні, аб жыцці, смерці і васкрасенні значна больш старажытнага паходжання, чым гэта думаюць веруючыя хрысціяне. Яна ўваходзіць ужо ў старажытнейшыя рэлігіі. Расказы, падобныя евангельскім, існавалі ў грэкаў, рымлян, персаў, вавіланян, егіпцян, яўрэяў і іншых народаў. Напрыклад, у будзійскай рэлігіі, якая ўзнікла год на 500 раней хрысціянства, існуе амаль такое-ж, як у казцы аб нараджэнні Хрыста, сказанне аб нараджэнні бога Буды ад «непарочнай маці». Нямала багоў старажытных рымлян, грэкаў абавязана было сваім паяўленнем на свет падобнаму-ж «цуду»—«непарочнаму зачатку». Легенда аб Хрысце прадстаўляе сабой абноўленае выданне ветхазаветнага прароцтва аб месіі, які павінен, быццам, прысці на грэшную зямлю і збавіць людзей. Хрысціяне, такім чынам, многія вякі спраўляюць свята «каляды» ва ўспамін аб падзеі, якой ніколі ў сапраўднасці не было.

Якое-ж першапачатковае паходжанне свята каляд? Навука даказвае, што гэтае зімовае свята ўваходзіць сваімі карнямі ў вельмі далёкае гістарычнае мінулае. Аб гэтым ярка сведчаць многія звычаі і абрады, якія веруючыя спраўляюць у час калядных свят. Ражэнне, слаўленне, калядаванне і т. д.—усе гэтыя абрады выконвалі нашы далёкія продкі, святкуючы сваё зімовае язычаскае свята. На працягу вякоў і тысячагоддзяў свята гэта перацярпела вялікія змяненні. Будучы спачатку ў дзікуноў святам у чэсць духаў продкаў, яно праяўляецца затым у старажытных земляробчых народаў у свята нараджэння «бога-сонца». Нарэшце, у класавым грамадстве яно стала святам нараджэння «бога-збавіцеля».

Хрысціянскія «каляды» сталі святкавацца 25 снежня ўпершыню толькі ў 354 годзе. Гэта дата святкавання і яе абрадавы бок былі запазычаны з персідскай рэлігіі («мітрыязма»), якая таксама сцвярджае, быццам-бы Мітра быў народжан у пячэры «непарочнай дзевай», быццам яму пакланяліся пастухі, а з неба чулася спяванне, быццам Мітра вырас і вучыў людзей, як выратавацца, наладжваў тайную вячэру, памёр, васкрэс і ўзнёсся на неба. Было ў мітраістаў і свята «нараджэння Мітры». Калісьці гэтым святам у чэсць «бога-сонца» адзначаўся пераход ад зімовых работ да вясенніх і спраўляўся ён у дзень «васкрашэння Мітры»—у перыяд зімовага сонцастаяння.

У X веку, калі хрысціянства было занесена з Візантыі на Русь, у славян існавала сваё зімовае рэлігійнае свята, так званыя «святкі». У працэсе зліцця хрысціянскіх «каляд» з язычаскімі «святкамі» розныя святочныя абрады і звычаі ўвайшлі ў хрысціянскі культ, склалі абрадавы бок «каляд». Хрысціянскія папы ў некаторых выпадках нават садзейнічалі такому змяшэнню абрадаў і свят, бо такім шляхам лягчэй было насаджаць новую рэлігію.

Яшчэ і зараз дзе-ні-дзе ў вёсках можна сустрэць гэтыя перажыткі язычаскай старажытна-славянскай рэлігіі: напрыклад, калядны звычай паліваць вадой двары і стойлы для жывёлы, есці куццю (кашу з хлебных зёран з мёдам), убіраць стол калоссямі жыта, ячменю, грэчкі, прыбірацца, гадаць, калядаваць, частаваць «дзядулю дамавога» і т. д.

Навукай, значыць, даказана, што хрысціянскае свята «каляды» і хрысціянскія расказы аб нараджэнні Ісуса Хрыста не арыгінальныя, яны запазычаны ў іншых народаў, узяты з іншых рэлігій.

Царква, рэлігія здаўна служаць зброяй закабалення працоўных. Памешчыкам і капіталістам выгадна, каб працоўныя верылі ў бога, каб яны цярпелі пакуты і галечу на зямлі ў імя блажэнства, якое абяцае ім рэлігія «на тым свеце». Усякая рэлігія вучыць рабочых і сялян цярпець прыгнечанне эксплаатацыі, пакутваць ад несправядлівасці, любіць сваіх ворагаў—эксплаататараў.

Гэтай-жа мэце служыць і свята «каляды». Заклікаючы працоўных у царкву, папы штогодна адурманьваюць іх рэлігійнымі казкамі аб тым, што шчасце, збаўленне людзей залежыць не ад саміх людзей, не ад таго, як хутка яны знішчаць капіталізм на зямлі, а ад бога. А для таго, каб працоўныя «заслужылі» гэта збаўленне, папы прапануюць ім цярпець і пакутваць, пакорна зносіць капіталістычнае прыгнечанне. У дні «каляд» гэта эксплаататарская ідэалогія прапаведуецца асабліва ўзмоцнена. Ва ўсіх цэрквах пяецца і паўтараецца на тысячу ладоў вядомае каляднае песнапенне: «Слава в вышних богу, на земле мир и в человецех благоволение». Гэтыя словы прама заклікаюць веруючых працоўных да класавага міру, да міру з іх злейшымі ворагамі. Нечага і гаварыць, што такая пропаведзь вельмі выгадна капіталістам і памешчыкам, карысна імперыялістам. Таму эксплаататарскія класы заўсёды і ўсюды падтрымліваюць рэлігію і яе святы, хоць самі часта і не вераць у існаванне бога.

У нашай краіне няма капіталістаў, у нас эксплаататарскія класы ліквідаваны. Гэта значыць, што ў СССР няма класаў, якія зацікаўлены ў захаванні і ўмацаванні рэлігіі. Аднак рэлігійныя перажыткі працягваюць жыць яшчэ ў свядомасці значнай часткі працоўных.

Ворагі сацыялізма, абапіраючыся на рэлігійныя перажыткі, выкарыстоўваючы іх, імкнуцца панесці шкоду сацыялістычнаму будаўніцтву, перашкодзіць комуністычнаму выхаванню мас, знізіць прадукцыйнасць працы, выклікаць прагулы і прастоі на вытворчасці, затармазіць распаўсюджванне навукі ў народзе, падарваць абароназдольнасць краіны.

Таварыш Сталін указваў, што «рэлігійныя забабоны ідуць супроць навукі, бо ўсякая рэлігія ёсць нешта процілеглае навуцы».

Доўг свядомых грамадзян нашай краіны—расказаць працоўным-веруючым аб тым, якую шкоду прыносяць рэлігійныя святы. Трэба разъясніць ім класавую сутнасць гэтых свят, пераканаць тых, хто яшчэ не расстаўся з рэлігійнымі перажыткамі, пакончыць з рэлігіяй і кінуць назаўсёды яе дзікунскія, шкодныя звычаі.

Ф. Олешчук.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 21 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе, што «У ноч на 21 снежня буйныя злучэнні германскай авіяцыі зрабілі налёты на важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Бамбардыроўцы падвергліся таксама партовыя і прамысловыя збудаванні ў Ліверпулі, на якія былі скінуты тысячы фугасных і запальваючых бомб. У раёне бамбардыровак узнікаі шматлікія буйныя пажары і ўзрывы.

Мінулай ноччу самалёты праціўніка зрабілі налёт на Берлін. Бамбардыроўцы падвергліся выключна неваенныя аб'екты. Рад дамоў пашкоджан. Сярод грамадзянскага насельніцтва налічваюцца забітыя і раненыя.

Зенітная артылерыя збіла два непрыяцельскіх самалёты.

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 21 снежня. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі 21 снежня апублікавала наступнае камюніке: «Учора англійскія самалёты берагавой абароны зрабілі некалькі налётаў на аэрадромы і парты на тэрыторыі, акупіраванай непрыяцелем. Падвергліся бамбардыроўцы артылерыйскія пазіцыі паблізу мыса Гры Нэ.

У ноч на 21 снежня англійская авіяцыя зрабіла налёты на Берлін, Рурскую вобласць і парты на акупіраванай Германіяй тэрыторыі. У Берліне адзначаны шматлікія пажары і ўзрывы на заводзе авіяцыйных матораў і ў некалькіх іншых пунктах. Пры налётах на парты асабліва добрыя вынікі адзначаны ў Остэндэ, Антверпене і Гаўры. На працягу ночы падверглісе бамбардыроўцы Флісінген, Булонь і докі ў Амстэрдаме. Усе англійскія самалёты, удзельнічаючы ў гэтых аперацыях, вярнуліся шчасліва на свае базы».

—о—

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

ЗВОДКА ІТАЛЬЯНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

РЫМ, 21 снежня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: У прыграніччай зоне Кірэнаікі адзначана актыўнасць артылерыі.

Ва Усходняй Афрыцы адно з злучэнняў італьянскай авіяцыі бамбардыравала ў Адэне аэрапорт. Бомбы былі скінуты таксама на пэмпыцельскія збудаванні ў зоне Метэмы, дзе налічыся вялікія пажары.

На грэчаскім фронце ўсе атакі праціўніка адбіты. Італьянская авіяцыя рабіла аперацыі ва ўзаемадзеянні з наземнымі войскамі. Авіяцыя бамбардыравала скапленні войск праціўніка, дарогі і ваенныя ўмацаванні ва ўсіх сектарах фронта. Каля о. Корфу патанулена два буйных рыбалоўных судны. У часе некалькіх паветраных баёў збіта два англійскіх самалёты. Адзін з нашых самалётаў не вярнуўся на сваю базу. Нашы ваенныя карабі зрабілі паспяховую бамбардыроўку непрыяцельскіх пазіцый уздоўж узбярэжжа Іанічаскага мора.

Вайна ў Албаніі і Афрыцы

(Агляд ваенных дзеянняў з 14 па 21 снежня).

Трынаццаты дзень працягваюцца жорсткія баі ў Заходняй пустыні на фронце працягам звыш 60 кіламетраў. У аперацыях удзельнічаюць буйныя сілы войск, танкі і авіяцыя.

Паводле даных замежных ваенных аглядальнікаў, непасрэдны ўдзел у наступленні ў Заходняй пустыні прымае 120-тысячная добра матызаваная англійская армія, у саставе якой маюцца аўстралійскія, індыйскія і новазеландскія дывізіі, да 800 танкаў і бронемашын і каля 500 самалётаў. Па тых-жа даных, італьянскае камандаванне да пачатку наступлення англічан мела 200 тысяч войск у саставе двух армій, буйныя мотамеханізіраваныя часці і звыш 600 самалётаў. Італьянскія войскі размяшчаліся ваеннымі лагерамі на шырокім фронце ад Сідзі-Барані да аазіса Джарабуб. Непасрэдна ў раёне пачаўшыхся баявых дзеянняў італьянцы мелі на фронце ад Сідзі-Барані да Нібейва 5 дывізій.

На працягу мінулага тыдня англійскія войскі пасля заняцця Сідзі-Барані скансэнтрыравалі ўсе свае намаганні на захопе не менш важнага ў гэтай частцы Егіпта парта Солум, размешчанага ў 10 кіламетрах ад лівійскай граніцы. Буйныя мотамеханізіраваныя сілы англічан, ахапляючы паранейшаму правы фланг адыходзячых італьянскіх часцей, накіраваліся да мора на напрамку да Капуца—Бардзія, у той час, як асноўныя пяхотныя часці наступалі ўздоўж узбярэжжа. Італьянскае камандаванне паспела хутка перакінуць з Лівіі падмацаванні з лепшых мотамеханізіраваных і артылерыйскіх часцей і тым самым адзначыла планамерны адыход сваіх войск. Аднак італьянцы панеслі пры гэтым вялікія страты, галоўным чынам палоннымі.

На працягу 15 і 16 снежня асабліва жорсткія баі разгарнуліся ў раёне Солума (на подступах да якога італьянцы на працягу апошніх месяцаў стварылі ўмоцненыя пазіцыі) і на лівійскай граніцы ля форта Капуца. У выніку гэтых баёў англійскія войскі цаною цяжкіх страт у людзях і матэрыяльнай часці аўладалі ўказанымі пунктамі.

У цяперашні час ваенныя дзеянні адбываюцца непасрэдна на лівійска-егіпецкай граніцы, хаця некаторым матарызаваным і танкавым часцям англічан удалося праравацца ў пагранічную зону Лівіі і дасягнуць знешніх умацаванняў Бардзіі. З-за пачаўшыхся даждоў цэнтр аперацый некалькі аслаб, к таму-ж англійская армія знаходзіцца ад сваіх зыходных баз адлеглы на працягу 120—150 кіламетраў. З прычыны гэтага забеспячэнне фронта моцна затруднена. Італьянцы, не глядзячы на штодзённыя налёты англійскай авіяцыі на адзіную шасейную дарогу, якая ідзе ад Бардзіі ўглыб краіны, перакідваюць у раён Бардзіі свежыя сілы, рыхтуючыся, відавочна, да рашучага супраціўлення.

* * *

На албана-грэчаскім тэатры ваенных дзеянняў італьянцы змаглі некалькі замацаваць становішча на цэнтральным фронце (у раёне ракі Осум) і асабліва на паўночным участку фронта, перакінуўшы сюды пры дапамозе авіяцыі значныя падмацаванні. Аднак ініцыятыва ўсё яшчэ знаходзіцца ў руках грэкаў, якія аказваюць моцнае даўленне ў раёнах Клісуры, Тэпелене і Хімары.

У паўночным сектары албанскага фронту, дзе дзейнічаюць галоўныя сілы 9-й італьянскай арміі, асноўную ўвагу італьянцы ўдзяляюць узмацненню свайго левага фланга, які размешчаны ў гарах Камна, Мокра і на поўнач ад Паградзеца. Гэты фланг мае асаблівае значэнне, бо ён прыкрывае праходы ў гэтых гарах у даліну ракі Шкумба і адзіную шасейную дарогу, якая вядзе на Эльбасан у глыбокі тыл аперыруючым у Албаніі італьянскім войскам. На працягу ўсяго тыдня тут адбываюцца жорсткія баі, але ўсе спробы грэкаў прасунуцца ўперад ліквідуюцца моцнымі контратакамі італьянцаў. У сувязі з тым, што глыбіня снежнага пакрыцця месцамі дасягае на гэтым участку адна—паўтара метраў, італьянскае камандаванне ўводзіць у дзеянне атрады лыжнікаў.

Асабліва ўпорныя баі за мінулы тыдзень адбываліся на фронце 11-й італьянскай арміі—у раёнах Клісуры, Тэпелене і на ўзбярэжжы Хімары. Пасля заняцця Прэмета, Аргіракастрона і Санты-Кваранта грэчаскія войскі, выкарыстоўваючы атрыманыя імі перавагі, павольна, але ўпорна прасоўваюцца ўперад. Часці 11-й італьянскай арміі, адыходзячыя на добра ўмоцненыя пазіцыі 2-й лініі абароны, нараходзячыя праз Клісуру, Тэпелене і далей на паўночны захад ад Хімары, аказвалі грэкам упорнае супраціўленне. Шматразовыя спробы грэчаскіх войск прарвацца да гэтых буйных вузлоў шасейных дарог адбіваліся моцнымі контратакамі італьянцаў. Умацуючыся ў пемагчымасці прарыву італьянскіх умацаванняў з фронта, грэчаскія часці прадпрынялі абходныя наступальныя дзеянні.

Да 21 снежня грэкам удалося прасунуцца к гарам Трэбешіне (у 6 кіламетрах на захад ад Клісуры), а таксама захапіць вёскі Дукай і Салары (у 10 кіламетрах на паўночны захад ад Тэпелене). Такім чынам, грэкі перарэзалі дарогу Тэпелене — Валона. У прыбярэжным сектары грэчаскія войскі, абыходзячы Хімару з поўначы, дасягнулі гары Калазат, заняўшы вёску той-жа назвы (у 5 кіламетрах на поўнач ад Хімары) і вёску Вуно па дарозе Хімара—Валона. Аднак само грэчаскае камандаванне прызнае, што гэтыя поспехі маюць толькі мясцовае значэнне.

У цяперашні час італьянцы перакідваюць на фронты Албаніі буйныя падмацаванні, шырока выкарыстоўваючы для гэтага авіяцыю і судны з малай асадкай для высадкі войск у невялікіх бухтах албанскага ўзбярэжжа. Іх знішчальная авіяцыя прыкрывае галоўныя парты выгрузкі войск і ўзбраення — Валону і Дурацо.

Маёр А. Васільеў.


Выступленне Чэрчыля ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора прэм'ер-міністр Чэрчыль выступіў у палаце абшчын з аглядам ваенных дзеянняў у Заходняй пустыні. Чэрчыль заявіў, што буйныя англійскія сілы, якія атрымліваюць новыя падмацаванні, працягваюць атакаваць форт і горад Бардзія і што ёсць усе падставы меркаваць, што падзеі разгортваюцца шчасліва для Англіі. Чэрчыль указаў, што лічба ў 30 тысяч італьянскіх ваеннапалонных значна зменшана. Англійскія часці захапілі 100 зусім прыгодных гармат, 50 танкаў, вялікую колькасць ваеннай маёмасці. Да 16 снежня страты англійскай арміі склалі менш 1 тысячы чалавек забітымі і ранепымі. Мы, несумненна, заявіў Чэрчыль, мелі і іншыя страты. Чэрчыль далей адзначыў, што ні ў якім выпадку нельга лічыць наступленне ўжо закончаным. Чэрчыль выразіў надзею, што дзякуючы прадпрынятым да гэтага часу намаганням, а таксама буйным пастаўкам для Англіі з ЗША, Англія будзе мець вялікую і добра ўзброеную армію, якая зможа ў 1941 годзе быць выкарыстана не толькі для абароны брытанскіх астравоў, але і на іншых тэатрах вайны.

Далей Чэрчыль указаў, што вайна можа працягнуцца доўга; ён перасцерагаў супроць пачуцця задаволенасці дасягнутымі поспехамі. «Было-б катастрофай, — сказаў ён, — калі-б хто-небудзь меркаваў, што небяспека, велізарная небяспека ўжо прайшла». Паветраныя баі некалькі паслабілі, магчыма, з прычыны непрыемнага надвор'я. Але, заявіў Чэрчыль, не выключана, што яны паслабілі з прычыны вядучайся падрыхтоўкі праціўніка да якой-небудзь іншай формы актыўнасці. Трэба чакаць працягу начных атак германскай авіяцыі.

У заключэнне прэм'ер-міністр закрануў пытанне аб стратах англійскага флота ў Атлантыцы, размер якіх працягвае выклікаць значную трывогу. Гэтыя страты, заявіў ён, не такія, як у самы крытычны перыяд 1917 года. Аднак зноў паявілася пагроза, з якой год таму назад, здавалася, Англія спраўлялася. Чэрчыль указаў, што трэба лічыць адной з першачарговых задач ахову гандлёвага шляху праз Атлантычны акіян супроць падводных лодак і самалётаў дальняга дзеяння, якія зараз нападаюць на англійскія параходы.





Новапабудаваны будынак дзіцячага сада ў калгасе імені Варашылава, Супраслеўскага сельсовета, Беластоцкага раёна, разлічаны на 150 дзяцей. Фото А. Сапіра.

На юбілейным вечары Янкі Купалы

20 снежня ў памяшканні Беластоцкага педагагічнага інстытута адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 35-годдзю літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР, ордэнаносца Янкі Купалы.

Пасля ўступнага слова паэта Максіма Танка, які адкрыў літаратурны вечар, з дакладам аб творчым шляху Янкі Купалы выступіў член рэспубліканскай юбілейнай камісіі паэт Філіп Пестрак. Дакладчык прааналізіраваў дарэвалюцыйную творчасць Янкі Купалы, яго зборнікі «Жалейка», «Шляхам жыцця» і іншыя, спыніўшыся на асобных творах паэта, якія ўвайшлі ў скарбніцу савецкай і сусветнай літаратуры, як узоры лепшай дэмакратычна-рэвалюцыйнай паэзіі.

Пасля даклада паэт Максім Танк прачытаў верш, прысвечаны юбіляру. Выступленне мела вялікі поспех. З чытаннем твораў Янкі Купалы ў перакладзе на польскую мову выступілі польская пісьменніца Елена Сельм і паэт Юрый Равіч; з вершамі ў перакладзе на яўрэйскую мову выступіў яўрэйскі паэт Эміёт. Рускі паэт Канстанцін Цітоў прачытаў «Табе, правадыр» Янкі Купалы ў перакладзе на рускую мову.

У мастацкай частцы вечара выступіў ансамбль песні і пляскі Беластоцкай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Цёпла сустрэнуты прысутнымі, ансамбль з вялікім майстэрствам выканаў цэлы рад беларускіх, польскіх, грузінскіх песень і танцаў. З выключным майстэрствам былі выканаы беларуская народная песні «Вярба», «Сухі дуб», «Вечарынка ў калгасе» (тэкст Янкі Купалы), «Бывайце здаровы» і іншыя. З нязменным поспехам былі выканаы і народныя беларускія танцы—«Чарот», «Качан», «Лявоніха».

НОВЫЯ КНІГІ

Беластоцкім аддзяленнем КОГІЗ'а атрыманы новыя кнігі для бібліятэк і кніжных магазінаў горада і вобласці.

Сярод прыбыўшых кніг— 2 тысячы экземпляраў «Пытанні ленінізма» Сталіна на польскай мове, чацвёрты і пяты томы 12-томніка выбраных твораў Леніна.

З кніг на рускай мове атрымана: 6 тысяч экземпляраў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», творы Ванды Васілеўскай «Зямля ў ярме», «Радзіма», «Полымя на балотах» і «Воблік дня».

—•—

ХЛЕБАЗАВОД У ВАЛКАВЫСКУ

У Валкавыску на Заходняй вуліцы знаходзіцца старая прымітыўная хлебапякарня, якая да гэтага часу выпякала ў суткі 7 тон хлеба. Зараз пякарня пашыраецца і пераўтвараецца ў хлебазавод. Устанаўліваюцца тры новыя печы, механічнае абсталяванне, буравіцца свідравіна для студні. Да 1 красавіка 1941 года будаўніцтва хлебазавода будзе закончана.

ПОСПЕХІ АРЦЕЛІ «ХІМПРАЦА»

Рыхтуючыся дастойна сустрэць дзень выбараў, калектыў арцелі «Хімпраца» яшчэ 4 снежня выканаў гадавы план, выпусціўшы прадукцыі на 3.400.000 рублёў.

Арцельшчыкі замацоўваюць поспехі, дасягнутыя ў сацыялістычным спаборніцтве. Снежаньская праграма выканана датэрмінова 20 снежня. Выпушчана прадукцыі на 406.600 рублёў.

Э. Гродзенская.

АРТЭЗІЯНСКІЯ СКВАЖЫНЫ

Днямі ў беластоцкую вадаправодную сетку ўключана дзве новыя глыбакаводныя артэзіянскія скважыны.

Вядуцца падрыхтоўчыя работы па бурэнню яшчэ адной глыбакаводнай артэзіянскай скважыны магутнасцю ў 100 кубаметраў вады ў гадзіну.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партжыцця — 16-10, эканамічнага аддзела — ... камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.

УБ — 137. Тыраж 12.000 экз Друкарня ...